■ Споведзь

# КАБ ДОЎЖЫЛАСЯ ЖЫЦЦЁ

**Новы мастацка-дакументальны твор Алеся Савіцкага «Пісьмо ў Рай» — выдатны раман-споведзь пісьменніка, узнёслае маленне, адрасаванае памерламу бацьку, які пражыў пякельна-пакутлівае жыццё і зазнаў цяжкую смерць. Аповед вядзецца ад імя лірычнага героя — Андрэя Смоліча. Твор прысвечаны памяці Ануфрыя Якаўлевіча Савіцкага і, відавочна, мае аўтабіяграфічную аснову.**




На старонках рамана-споведзі аўтар асэнсоўвае лёс беларускай нацыі падчас вайны і ў пасляваенны час. Унутраным зрокам пісьменнік уважліва паказвае вельмі супярэчлівую і драматычную эпоху, аглядае ўласнае пражытае жыццё і лёсы блізкіх яму людзей, з вышыні часу аналізуе розныя эпізоды і сітуацыі, у якія трапляў паводле асабістага жадання ці, часцей, па волі выпадку. Аповед у рамане часта перарываецца пранікнёнымі зваротамі галоўнага героя да памерлага бацькі, разважаннямі пра яго цяжкі лёс.

Вельмі светлыя і шчымліва-цёплыя ў рамане ўспаміны пра дзяцінства — эпізод пра лыжны пераход з Полацка ў Кутняны, сцэна шчодрай пачосткі ў цёткі Марфы, рыбалка на Дзвіне з жывым бацькам, паходы ў грыбы, наведванне Барысавага каменя, які ляжаў у Дзвіне і ў засушлівае лета, калі рака мялела, быў добра бачны. Надзвычай кранальныя ўспаміны аўтара пра маці.

На старонках твора пісьменнік згадвае шматлікія эпізоды з партызанскага жыцця, перадае ўласнае ўзрушэнне падчас наведвання месцаў колішніх бітваў. У яго памяці ўспліваюць найбольш яркія моманты змагання з фашысцкімі захопнікамі — выплаўка толу са снарадаў у кузні вёскі Пятроўцы, цяжкія бai партызанскай брыгады ўлетку сорак трэцяга года, жахлівая смерць баявых таварышаў, раненне і лячэнне ў палявым шпіталі.

Вельмі павучальныя ўражанні Алеся Савіцкага ад наведвання Германіі і знаёмства з колішнім салдатам вермахта, які ў гады вайны трапіў у савецкі палон, але здолеў выжыць і вярнуцца дамоў. Яго жыццё кантраставала з жыццём тых, хто перамог фашызм, бо яго ніхто не дакараў і нічым не папракаў.

Як пісьменнік-рэаліст Савіцкі паказаў драматызм жыцця — акупацыю немцамі Беларусі, бежанства людзей на ўсход, вяртанне на захопленую ворагам тэрыторыю, перыпетыі ваеннага часу. Пісьменнік раскрыў трагедыю людзей, лёсы якіх былі зламаны вайной і сталінскімі рэпрэсіямі. Так, бацька галоўнага героя Смоліча быў асуджаны на пяць гадоў і адпраўлены ў лагер толькі за тое, што трапіў у палон і не змог застрэліцца, бо ў нагане скончыліся патроны.

Асабліва драматычным быў лёс дзяўчат і маладых жанчын, якія аказаліся на акупаванай тэрыторыі і прайшлі праз неверагодныя пакуты і здзекі. Маналог маладой жанчыны Жанны — сведчанне жахаў, што прынеслі вайна і фашызм на беларускую зямлю. Не менш трагічным аказалася жыццё дзяўчыны падчас вяртання бальшавікоў і чэкістаў, якія прагнулі кантраляваць усё грамадства. Душэўныя пакуты і ўнутраны боль жанчыны аказаліся мацнейшымі за прагу да жыцця — і яна, урэшце, пайшла на самагубства.

**Мудрасць, веды і досвед продкаў, на думку Алеся Савіцкага, — асноўны стрыжань паўнавартаснага працягу жыцця.**

Раман-споведзь «Пісьмо ў Рай» адрозніваецца асаблівым псіхалагізмам: ён незвычайна эмацыйны, напоўнены людскім болем, роспачу і невымернай тугой. Сцэна атрымання ліста ад жывога бацькі, якога лічылі без вестак прапаўшым у сорак першым годзе, уражвае глыбінёй перажыванняў героя. Алесь Савіцкі бліскуча перадаў пакуты сям'і салдата-франтавіка, які быў несправядліва сасланы ў лагер на востраў Пуцяцін, што ў Японскім моры. Пісьменнік распавядае пра неверагодныя перажыванні маці, якая страціла мужа і двух сыноў. Пасля гэтай трагедыі жыццё для яе згубіла ўсялякі сэнс.

Мастацкімі сродкамі майстар слова паказаў неверагодны боль, бясконцую крыўду і адчай юнака, які атрымаў чорную вестку пра смерць бацькі ў лагеры. Разгублены Андрэй Смоліч адчувае безвыходнасць і поўную бездапаможнасць, не ведае, што рабіць, каму скардзіцца, каго прасіць і каго вінаваціць. Да глыбіні душы ён узрушаны і пасля наведвання лагера ваеннапалонных чырвонаармейцаў у Баравусе. Убачанае і пачутае там урэзалася ў яго памяць на ўсё жыццё. Небывалы душэўны боль зазнаў герой рамана, калі даведаўся праўду пра дзяўчыну, якую пакахаў усім сэрцам.

На старонках рамана-споведзі Алесь Савіцкі надзвычай дэталёва асвятліў працэс развіцця з ілюзіямі тых людзей, якія шчыра верылі ў непагрэшнасць Іосіфа Сталіна. Так, галоўны герой Андрэй Смоліч піша яму ліст, у якім распавядае пра невінаватасць бацькі, пра сваю веру ў справядлівасць і бясконцую адданасць «дарагому правадыру». Але ў адказ ён атрымлівае кароценькае паведамленне следчага з Упраўлення па справах рэабілітацыі, дзе катэгарычна заяўлялася пра адсутнасць належных падстаў для перагляду справы. На новы ліст да Сталіна герой атрымаў чарговую адпіску, напоўненую «бяздумнай паспешлівасцю, пагардлівасцю і абыякавасцю».

Алесь Савіцкі справядліва і гістарычна дакладна піша пра тое, што ў перыяд кіравання Сталіна, Хрушчова і Брэжнева адукаваныя людзі выдатна бачылі рэаліі і ўсведамлялі сутнасць афіцыйнай прапаганды, якая прыхарошвала рэчаіснасць. Яны прыходзілі да смелай высновы пра тое, што палітыкі хаваюць праўду ад народа, а ў сваіх заявах і дзеяннях кіруюцца пераважна ўласнымі інтарэсамі.

Пісьменнік-інтэлектуал разважае аб складанасцях чалавечага лёсу і, урэшце, прыходзіць да высновы пра неабходнасць даравання, прымірэння, нават паміж самымі лютымі і заклятымі ворагамі. Ён выступае супраць фальшу і падману ва ўсіх сферах жыцця — у палітыцы, у адносінах паміж народамі, паміж сябрамі і каханымі. Хлусня, паводле яго слоў, заўжды вядзе да варожасці, непазбежных разбурэнняў і страт. У асабістым і сямейным жыцці падман і хлусня тым больш недапушчальныя, бо яны разбураюць давер і аснову жыцця.

Мудрасць, веды і досвед продкаў, на думку Алеся Савіцкага, — асноўны стрыжань паўнавартаснага працягу жыцця. Пісьменнік слушна гаворыць пра неабходнасць шанавання народных святыняў, захавання запаветаў бацькоў і дзядоў, павагі да зробленага і створанага імі: «Цяпер ведаю дакладна: калі чалавек не моліцца памяці бацькоў і дзядоў, калі не ахоўвае святыні свайго народа, дык на ягонай дарозе ружы не зацвітуць аніколі». Алесь Савіцкі ўпэўнены, што чалавек прыходзіць на зямлю з місіяй памнажаць прыгажосць гэтага свету, «каб нязводная на зямлі была толькі радасць».

Заключная сцэна рамана — назіранне за хлопчыкам, маленькім рыбачком, які злавіў на вуду вялізнага язя на Палаце і неверагодна шчаслівы ад улову, — сведчанне непахіснай веры пісьменніка ў добры набытак нашчадкаў.

**Іван САВЕРЧАНКА,**
**доктар філалагічных навук, прафесар.**

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

## ОБ ОТКРЫТОЙ ПРОДАЖЕ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ ЧЕТВЕРТОГО ВЫПУСКА

## Таварыства з абмежаванай адказнасцю «ЗахадІнвестСістэмз» (ТАА «ЗахадІнвестСістэмз»)

## Общества с ограниченной ответственностью «ЗападИнвестСистемз» (ООО «ЗападИнвестСистемз»)

г. Минск 2014 г.

**1. Полное и сокращенное наименование эмитента.**

На белорусском языке:

полное – Таварыства з абмежаванай адказнасцю «ЗахадІнвестСістэмз»;

сокращенное – ТАА «ЗахадІнвестСістэмз».

На русском языке:

полное – Общество с ограниченной ответственностью «ЗападИнвестСистемз»;

сокращенное – ООО «ЗападИнвестСистемз» (далее – эмитент).

**2. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail).**

Место нахождения эмитента: Республика Беларусь, 220070, г. Минск, ул. Радиальная, д. 54Б, третий этаж, каб. 12;

Телефон/факс: 8 (017) 346 41 37; (e-mail): info@tapas.by.

**3. Основные виды деятельности эмитента.**

Подготовка к продаже недвижимого имущества (код 70110 согласно Общегосударственному классификатору Республики Беларусь «Виды экономической деятельности» ОКРБ 005-2006).

**4. Номер расчетного счета эмитента, на который будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи облигаций, наименование обслуживающего банка.**

Расчетный счет в белорусских рублях № 3012154144014 в ОАО «БПС-Сбербанк» (адрес банка: бульвар имени Мулявина, 6, 220005, г. Минск, Республика Беларусь, БИК 153001369, УНП 100219673).

**5. Наименование периодических печатных изданий, определенных эмитентом для раскрытия информации и сроки таких публикаций.**

Бухгалтерская отчетность эмитента будет публиковаться в газете «Звязда» в срок не позднее трех месяцев со дня окончания отчетного финансового года.

Информация о принятом решении о реорганизации или ликвидации эмитента будет публиковаться в приложении к журналу «Юстиция Беларуси» в срок не позднее двух месяцев с даты принятия соответствующего решения.

Информация о возбуждении в отношении эмитента производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) будет публиковаться в печатных средствах массовой информации, учрежденных Высшим Хозяйственным Судом Республики Беларусь, в течение пяти дней с момента получения соответствующего судебного постановления.

Информация о внесенных изменениях в Проспект эмиссии будет публиковаться в газете «Звязда» в срок не позднее 7 (Семи) дней с даты государственной регистрации соответствующих изменений в регистрирующем органе.

**6. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента.**

Наименование депозитария: Открытое акционерное общество «БПС-Сбербанк» (далее – депозитарий).

Место нахождения депозитария: бульвар имени Мулявина, 6, 220005, г. Минск, Республика Беларусь.

Депозитарий зарегистрирован в Национальном банке Республики Беларусь 28 декабря 1991 г. (Регистрационный №25).

Специальное разрешение (лицензия) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам №02200/5200-1246-1086, выдано Министерством финансов Республики Беларусь, действительно по 30 января 2022 года.

**7. Размер уставного фонда эмитента.**

Уставный фонд эмитента 42 240 000 (Сорок два миллиона двести сорок тысяч) белорусских рублей.

**8. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение.**

Решение о четвертом выпуске жилищных облигаций (далее – облигации) принято Общим собранием участников эмитента 09 декабря 2014 г. (протокол от 09.12.2014 №31).

**9. Форма выпуска облигаций, объем эмиссии, количество облигаций.**

| | |
|---|---|
| Форма выпуска и вид облигаций | Бездокументарные, именные, конвертируемые |
| Объем эмиссии облигаций | 12 200 000 000 (Двенадцать миллиардов двести миллионов) белорусских рублей |
| Количество облигаций | 2 000 (Две тысячи) штук |
| Серия облигаций | ЗИС-4 |
| Номера облигаций | 000001-002000 |

**10. Номинальная стоимость облигации.**

Номинальная стоимость одной облигации составляет 6 100 000 (Шесть миллионов сто тысяч) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный 1 (Одному) квадратному метру общей площади жилого помещения в жилом доме № 4 в составе объекта «Жилые дома, не относящиеся к домам повышенной комфортности, по индивидуальным проектам в жилом районе «Дружба» по генплану на земельном участке, расположенном в Московском административном районе г. Минска (далее – Жилой дом).

**11. Цель выпуска облигаций и направления использования средств, полученных от размещения облигаций.**

Облигации выпускаются с целью привлечения денежных средств юридических и (или) физических лиц на осуществление строительства Жилого дома, на финансирование иных мероприятий, связанных со строительством указанного дома, а также на пополнение оборотных средств эмитента. Денежные средства, полученные от размещения облигаций, используются в соответствии с целями их выпуска.

**12. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по облигациям.**

В качестве обеспечения исполнения обязательств эмитента по облигациям выступает поручительство Общества с ограниченной ответственностью «ТАПАС» на сумму 12 200 000 000 (Двенадцать миллиардов двести миллионов) белорусских рублей согласно договору о предоставлении поручительства от 09.12.2014 №1/12

**13. Период размещения облигаций.**

Дата начала размещения облигаций – 22.12.2014.

Дата окончания размещения облигаций – 31.12.2017.

**14. Место, время и порядок размещения облигаций.**

Проведение открытой продажи облигаций осуществляется эмитентом ежедневно (за исключением выходных дней (субботы и воскресенья), государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь) с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: Республика Беларусь, 220070, г. Минск, ул. Радиальная, 54Б, третий этаж, каб. 12.

Открытая продажа облигаций осуществляется физическим и (или) юридическим лицам в соответствии с законодательством Республики Беларусь путем заключения соответствующего договора.

Жилищные облигации имеют право приобретать (как в процессе размещения жилищных облигаций, так и в процессе их обращения) юридические и физические лица, заключившие с эмитентом договор в простой письменной форме, предусматривающий обязательства эмитента по строительству жилых помещений владельцам жилищных облигаций.

Открытая продажа облигаций осуществляется по цене, определяемой эмитентом в зависимости от ситуации на рынке строительства и недвижимости на момент продажи жилищных облигаций, а также исходя из соотношения спроса и предложения на рынке ценных бумаг.

**15. Срок обращения облигаций.**

Срок обращения облигаций устанавливается с 22.12.2014 по 31.01.2018 (1136 календарных дней).

**16. Дата начала погашения облигаций.**

Датой начала погашения облигаций является 31.01.2018.

**17. Размер или порядок определения размера дохода по облигациям, условия его выплаты.**

Доход по облигациям не начисляется и не выплачивается.

**18. Дата и номер государственной регистрации облигаций.**

Облигации зарегистрированы Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 31 декабря 2014 г.

Регистрационный номер: 5-200-02-2492.

**19. Сведения о месте, времени и способе ознакомления с проспектом эмиссии облигаций.**

С более подробной информацией (проспектом эмиссии облигаций) можно ознакомиться по адресу: Республика Беларусь, 220070, г.Минск, ул. Радиальная, д. 54Б, третий этаж, каб.12 ежедневно (за исключением выходных дней (субботы и воскресенья), государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь) с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 или по телефону 8 (017) 346 41 37.

Генеральный директор
Управляющей компании эмитента А.Г. Савицкий

Ответственный
бухгалтер эмитента Н.Г. Гармашук